*Український історичний збірник, Вип. 12, 2009*

***Мацук Андрей***
***(Минск)***

# БАРАЦЬБА МАГНАЦКІХ ГРУПОВАК ВАКОЛ ТРЫБУНАЛА ВКЛ 1743 г.

Трыбуналы ВКЛ 1741 і 1742 гг. прайшлі ў зацятай барацьбе паміж «чарэйскімі» Сапегамі і Радзівіламі. Прычынай канфлікту былі дзве судовыя справы. Першая, аб спадчыне па Казіміру Леону Сапезе яго ўдавы Караліны з Радзівілаў і яго братоў лоўчага ВКЛ Міхала Антонія і віленскага каад'ютара Юзафа Станіслава Сапег. Сітуацыю ўскладняла тое, што Караліна выйшла замуж за бускага старосту Юзафа Ябланоўскага. Другая, з-за спадчыну па Антонію Казіміру Сапезе паміж Міхалам Антоніям і Юзафам Станіславам Сапегамі і яго сястрой Саламеяй Ганнай, якая была замужам за любашаньскім старостай Юрыям Радзівілам. Дапамогу Сапегам аказалі Масальскія, Салагубы і Чартарыйскія, якія не былі зацікаўлены, каб у ВКЛ усталявалася фактычная гегемонія Радзівілаў і іх родзічаў вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводы Міхала Вішнявецкага (жанаты на Тэклі з Радзівілаў) і канцлера ВКЛ Яна Фрэдэрыка Сапегі (паходзіў з «коданьскай» галіны роду і быў жанаты на Канстанцыі з Радзівілаў).

На Трыбунале ВКЛ 1741 г. перамаглі Сапегі і іх кааліцыянты. На наступным Трыбунале ВКЛ 1742 г. Радзівілам удалося ўзяць рэванш. Сапегі былі вымушаны пайсці на перамовы. Сапегі перад пагрозай разгляду судовых спраў на непрыхільным Трыбунале ВКЛ паспрабавалі скончыць мірам на сустрэчы з любашанськімі старостамі ў Беліцы, але перамовы скончыліся нічым. Адной з прычынаў зрыву перамоў у Беліцы было тое, што Радзівілы не пагаджаліся даць пісьмовае пацвярджэнне, што не маюць прэтэнзій на спадчыну з боку мсціслаўскай ваевадзянкі Тэадоры. Сапегам было вядома, што выклікана гэта было прапановамі Радзівілаў ажаніць Станіслава Радзівіла на дачцы Тэадоры Крысціне Розе, што дало б ім магчымасць зноў распачаць справу аб спадчыне па Антонію Казіміру Сапезе.[1] У такім выпадку губляўся ўсялякі сэнс дамовы. На думку Юзафа Станіслава Сапегі садзейнічала радзівілаўскім прапановам і сама мсціслаўская ваевадзянка Тэадора Сапежанка, якая пад час перамоў у Беліцы паказвала Радзівілам, што не супраць выдаць сваю дачку за Станіслава Радзівіла, а Сапегам, што згодна, каб мужам яе дачкі стаў ваўкавыскі гродскі староста Казімір Масальскі. На сам рэч яна такім чынам толькі меркавала сарваць канчатковую дамову паміж Сапегамі і Радзівіламі аб спадчыне па Антонію Казіміру Сапезе, каб потым атрымаць лепшыя ўмовы для сябе і сваёй дачкі.[2] Радзівілы і надалей праз Уршулю Францішку Радзівіл і Барбару Радзівіл імкнуліся ўсімі сіламі пераканаць мсціслаўскую ваевадзянку, каб яна выйшла замуж за рэчыцкага гродскага старосту Альбрэхта Радзівіла. Акрамя таго, стараліся, каб Тэадора пагадзілася выдаць дачку з-за крайчыца ВКЛ Лявона Радзівіла ці Станіслава Радзівіла. Тая, аднак, разумела, што ўсё гэта робіцца, каб пасварыць яе з Міхалам Антоніям Сапегай і таму адмаўляла Радзівілам. Тыя працягвалі і надалей ціснуць на яе і стараліся яе з Міхалам Антоніям Сапегай «пасварыць, а потым свае праекты выканаць».[3]

Сапраўднай мэтай удзелу Сапег у такіх перамовах было зацягванне часу, каб дачакацца сканчэння прыхільнага Радзівілам Трыбунала ВКЛ 1742 г. Зацягванне перамоў

не азначала сканчэння спрэчных спраў, якіх станавілася паміж Сапегамі і Радзівіламі ўсё больш і больш. Да справы Сапег з любашаньскімі старостамі далучаліся іх справы з Аскеркамі, наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла з саюзніцай кааліцыі надворнай маршалкоўнай ВКЛ Марцыбеліяй Завішанкай, якую падтрымлівалі і Агінскія.[4] У такіх абставінах кааліцыя вельмі сур'ёзна падрыхтавалася да трыбунальскай кампаніі 1743 г. Ужо ў канцы лістапада 1742 г. Юзаф Станіслаў Сапега канчаткова вырашыў, што мусіць расправіцца з Радзівіламі ў наступным Трыбунале ВКЛ.[5] Міхал Антоні Сапега ў пачатку лістапада 1742 г. узгадніў з Міхалам Чартарыйскім план выбараў на Трыбунале ВКЛ 1743 г. і хацеў пачуць меркаванні аб ім іншых удзельнікаў кааліцыі – брата Юзафа Станіслава Сапегі і троцкага кашталяна Міхала Масальскага.[6] Аб самім плане Міхал Антоні Сапега паведамляў, што «таго паперы давяраць ня можа». Потым хваліўся, што «такі дасканалы план, што роўных арлоў пераваліць можам».[7] Канчаткова планы наконт грамнічых соймікаў 1743 г. былі ўзгоднены паміж удзельнікамі кааліцыі ў Варшаве ў снежні 1742 г.[8]

З карэспандэнцыі вядомы некаторыя падрабязнасці гэтага плану. Міхал Антоні Сапега паведаміў віленскаму каад'ютару, што Міхал Чартарыйскі і Сымон Сіруць абяцалі правесці выбар дэпутатам у Коўне інстыгатара ВКЛ Станіслава Буржыньскага, але напамінаў «сакрэтна рэчы чыніць патрэбна».[9] Адносна кандыдатуры будучага маршалка было вядома, што кааліцыя не пагадзілася на кандыдатуру Ланеўскага, які «меў ахоту і дэпутатам і маршалкам стаць, але фінальную атрымаўшы ад князя падканцлера рэзалюцыю, што двор на кошт ласкі і тынфа не дась, хутка адмовіўся, бо такой каштоўнай функцыі не хоча».[10] Хадзілі чуткі, што магчыма старацца аб дэпутацтве і трыбунальскім маршалкоўстве будзе вількаўскі староста Юры Феліцыян Сапега.[11] Францішка Уршуля Радзівіл нават мела памылковыя звесткі, што яго выбару на наваградскім сойміку асабіста будзе дапамагаць Міхал Антоні Сапега.[12] На сам рэч выдае найбольшы сакрэт ва ўзгодненым плане заключаўся ў старанні самога Міхала Антонія Сапегі стаць дэпутатам і трыбунальскім маршалкам. З гэтым і была звязана адмова Ланеўскаму і Юрыю Феліцыяну Сапеге. Напрыканцы 1742 г. на сустрэчы Юзафа Станіслава і Міхала Антонія Сапег было зацверджана, што для сканчэння ўсіх спраў з Радзівіламі лоўчы ВКЛ павінен стаць дэпутатам і трыбунальскім маршалкам.[13]

Пад час сустрэчы Міхала Антонія і Юзафа Станіслава Сапег ў Чарлёне туды прыбыла і Тэадора Сапежанка, якая адкрыла ўсе планы Радзівілаў. Прыехаўшы да Чарлёны Міхал Масальскі прасіў рукі яе дачкі Крысціны Розы для свайго сына Казіміра. На яго карысць прасілі і Сапегі. Тая, аднак, адклала канчатковае рашэнне на пазнейшы час, бо, са слоў віленскага каад'ютара, прычынай былі іншыя планы жаніцьбы. Акрамя таго, не настойваў на жаніцьбе Міхал Антоні Сапега, які меў іншыя планы адносна кандыдатуры будучага мужа Крысціны Розы.[14] Такое зацягванне рашэння ў справе замужжа Крысціны Розы не прывяло да канфлікту ўнутры кааліцыі і не сапсавала адносінаў Масальскага і Сапег.

Адначасова ўважліва ўнутры кааліцыі Сапегі адносіліся да супрацоўніцтва з Чартарыйскімі і імкнуліся, каб ніякія справы не пашкодзілі яму напярэдадні грамнічных соймікаў. Таму на думку Юзафа Станіслава Сапегі ў справе спадчыны па Карэцкіх спачатку трэба было пагадзіцца з Чартарыйскімі, хаця існавалі прапановы і ад іншых прэтэндэнтаў вялікага маршалка Паўла Сангушкі і Любамірскіх. Прычына была ў супрацоўніцтве з Фаміліяй у ВКЛ, бо ў выпадку, калі Сапегі дамовіліся б спачатку з Сангушкамі і Любамірскімі, то Чартарыйскія маглі пакрыўдзіцца і адмовіцца дапамагаць ім у Трыбунале ВКЛ.[15] Дапамога Чартарыйскіх сапраўды была вельмі карыснай для Сапег. Прыхільнікі Фаміліі нават прысутнічалі ў пачатку снежня 1742 г. пад час сустрэчы ў

Чарлёне, сярод і іх вылучаліся Аскеркі.[16] Напэўна тады ж яны і дамовіліся з Сапегамі аб дапамозе выбару Міхала Антонія Сапегі на мазырскім сойміку.

У пачатку 1743 г. Сапегам стала вядома, што аб трыбунальскім маршалкоўстве думае і віцебскі кашталян Станіслаў Агінскі. Міхал Антоні Сапега ў такім выпадку лічыў, што «можам адзін другому ўступіць» і пагаджаўся стаць маршалкам Скарбовага Трыбунала.[17] Агінскі, аднак, не рашыўся старацца аб дэпутацтве і трыбунальскім маршалкоўстве. Хаця яшчэ ў лютым 1743 г. Радзівілы мелі звесткі, што ён мае такія планы і мяркуе стаць дэпутатам на якім-небудзь з «рускіх» соймікаў.[18]

Аслабляла Радзівілаў і пазіцыя канцлера ВКЛ Яна Фрэдэрыка Сапегі, які імкнуўся лавіраваць паміж Сапегамі і Радзівіламі, займаў нейтральную пазіцыю і стараўся скончыць кампрамісам усе спрэчныя справы. Ян Фрэдэрык Сапега вельмі сажалеў, што на перамовах у Беліцы не ўдалося скончыць кампрамісам справу паміж Сапегамі і наваградскімі ваяводамі Радзівіламі. Заклікаў старацца аб кампрамісе і саюзе паміж Радзівіламі і Сапегамі і лічыў лепшым месцам для перамоў рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ у Вільне.[19] Праўда, працягваў канцлер ВКЛ супрацоўнічаць з нясвіжскімі Радзівіламі ў справе будучага Трыбунала ВКЛ. Ужо ў сярэдзіне лістапада 1742 г. у рэчышчы радзівілаўскіх планаў выступаў супраць кандыдатуры Ігната Ланеўскага на трыбунальскае маршалкоўства і прапаноўваў, каб радзівілаўскім кандыдатам стаў жмудскі кашталян Юзаф Салагуб.[20] У той жа час даслаў канцлер ВКЛ свайго сакратара і да Сапег для ўзгаднення планаў наконт будучага Трыбунала ВКЛ.[21] Пасля сапежынскіх тлумачэнняў канцлер ВКЛ паведамляў Юзафу Станіславу Сапезе, што ад Радзівілаў меў зусім іншую інфармацыю пра прычыны зрыва перамоў у Беліцы. Акрамя таго, прапаноўваў як мага хутчэй выдаць замуж мсціслаўскую ваевадзянку, каб яна па сваёй ініцыятыве не выйшла за каго-небудзь варожага Сапегам.[22] Фактычна такое стаўленне Яна Фрэдэрыка Сапегі азначала, што ён не хацеў падтрымліваць Радзівілаў у рэалізацыі іх планаў адносна Сапег.

Кааліцыя згодна плану збіралася правесці выбары на грамнічных сойміках. Міхал Антоні Сапега напамінаў брату Юзафу Станіславу наглядаць за выбарамі за вызначанымі яму згодна з планам соймікамі.[23] У сваю чаргу Міхал Чартарыйскі напісаў лісты да Саванеўскага і Барэйкі, каб яны дапамагалі Юзафу Станіславу Сапезе на віленскім сойміку.[24] Іншы прыхільнік Фаміліі Гараін, таксама, павінен быў дапамагаць Сапегам на віленскім сойміку.[25] Наваградскі соймік ад Сапегаў пільнаваў Юры Феліцыян Сапега. Было вядома, што ў наваградскае ваяводства прыбыў і польны гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл і таму невыключалася, што ён прыме актыўны ўдзел у наваградскім сойміку. Юры Феліцыян Сапега паведамляў, што і ў Пінску будуць пададзены пратэсты, нягледзячы на прысутнасць вялікага гетмана ВКЛ Міхала Вішнявецкага. Сам жа прасіў астатніх Сапег уважліва сачыць за іншымі соймікамі і асабліва троцкім.[26] Міхал Антоні Сапега пастараўся аб выбары прыхільных дэпутатаў у Лідзе і быў упэўнены, што калі не будуць абраны сапежынскія прыхільнікі, то соймік будзе сарваны. Пастараўся ён аб выбары сваіх прыхільнікаў на слонімскім сойміку, але прасіў назіраць за ім свайго брата Юзафа Станіслава Сапегу.[27] Прасіў Міхал Антоні Сапега віленскага каад'ютара, каб ён падтрымаў імкненні іх прыхільніка Грабоўскага стаць дэпутатам.[28] Акрамя таго, да Полацка, Оршы, Рэчыцы і Брэста Міхал Антоні Сапега выправіў сваіх прадстаўнікоў, якія павінны былі кантраляваць выбары на мясцовых сойміках.[29] Кааліцыянт Сапег Масальскі прасіў іх падтрымаць старанні аб дэпутацтва заржыцкага старосты Пятра Францкевіча на экзулянцкіх сойміках. Прасіў падтрымкі ад імя пісара ВКЛ Антонія Пшаздзецкага і для Тадэвуша Юндзіла ў Гародне і мінскага падсудковіча Юзафа

Валадковіча*.[30] Аб падтрымцы сваіх прыхільнікаў заржыцкага старосты Францкевіча і мінскага падсудковіча Юзафа Валадковіча прасіў Юзафа Станіслава Сапегу і сам Антоні Пшаздецкі.[31] Падканцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі напісаў лісты да сваіх прыхільнікаў, каб тыя не дапускалі выбару на сойміках вайскоўцаў, бо яны знаходзіліся пад уплывам гетманаў.[32] Сам даслаў лідскага харужыца Францішка Александровіча на лідскі соймік для выбара прыхільных дэпутатаў. Прасіў Юзафа Станіслава Сапегу падтрымаць стаць дэпутатам на старадубскім сойміку люблінскі чашнік Станіслаў Панятоўскі. Акрамя таго, папярэджваў Сапег на падставе атрыманых ад браслаўскага гродскага старосты Яна Гільзена звестак, што на браслаўскім сойміку будуць абраны непрыхільныя дэпутаты.[33] Сваю дапамогу для кааліцыі на троцкім сойміку абяцаў шляхціц Канарскі.[34]

Спрабавалі ўдзельнікі магнацкай кааліцыі перашкодзіць і радзівілаўскім планам. Міхал Антоні Сапега даведаўся ад Юзафа Ліндэмана, які быў пасланы на ковенскі соймік наваградскімі ваяводамі Радзівіламі, што ў Коўне загадана не дапусціць выбару дэпутатамі радзівілаўскіх ворагаў і старацца, каб дэпутатамі сталі толькі мясцовыя шляхціцы.[35] Акрамя таго, лоўчы ВКЛ і Тэрэза Сапежанка спрабавалі пераканаць шляхціца Чарневіча не перашкаджаць прыхільнікам кааліцыі і дзейнічаць на ковенскім сойміку згодна жаданням Сымона Сіруця.[36]

Зразумела, што выбары ў Трыбунал ВКЛ неслі значныя фінансавыя выдаткі. Дапамога прыйшла з Кароны. Фінансавую дапамогу ў выглядзе пазыкі Сапегам гатовы быў зрабіць сандамірскі ваявода Ян Тарло. Для яе атрымання Сапегам было дастаткова толькі даслаць у Люблін свайго прадстаўніка.[37] Зразумела, што мэтай Тарло была не дабрачынасць, а імкненне дапамагчы саапернікам Радзівілаў у ВКЛ, каб адцягнуць сілы тых ад барацьбы за спадчыну па Сабескіх. Хадзілі чуткі, што пазычылі Сапегам грошы інфлянцкі падкаморы Ян Борх і браслаўскі гродскі староста Ян Гільзен.[38] Радзівілы наадварот напярэдадні грамнічых соймікаў знаходзіліся ў складанай фінансавай сітуацыі. Напрыканцы 1742 г. Ганна Радзівіл жалілася сыну Міхалу Казіміру Радзівілу, што ня можа нідзе знайсці грошай, бо з-за вайны нельга пазычыць іх з Расіі і Прусіі.[39]

Адначасова кааліцыя вырашыла не распачынаць справы з Радзівіламі аб «нойбургскіх уладаннях»,** хаця прускі кароль прапаноўваў выкупіць свае прэтэнзіі да гэтых уладанняў

* З дакумента невядома з якога сойміка меркаваў стаць дэпутатам Валадковіч. Напэўна, што такім соймікам мог быць мінскі ці адзін з двух экзулянцкіх. На карвсць гэтай думкі кажа тое, што ў Мінску сам Валадковіч меў падтрымку мясцовай шляхты, а карыснай дапамога Юзафа Станіслава Сапегі магла быць на смаленскім ці старадубскім сойміках.

** Слуцкае і Капыльскае княствы, Себежскае і Невельскае графствы, Копысь, Раманава, Беліца, Койданава, Біржы, Заблудаў і інш. Яны з'яўляліся спадчыннымі ўладаннямі згаслай пасля смерці Багуслава Радзівіла ў 1669 г. біржанскай галіны Радзівілаў. Большасць гэтых уладанняў знаходзілася ў ВКЛ. З-за адсутнасці ў Багуслава Радзівіла нашчадкаў па мужчынскай лініі яго ўладанні ў спадчыну атрымала дачка Людвіка Караліна, якая выйшла другі раз замуж за нойбургскага князя Карла Філіпа. Апошні пасля смерці Людвікі Караліны, ужо як рэйнскі электар, з'яўляўся апекуном гэтых уладанняў пры сваіх малалетніх унучках. Падрабязней аб праблеме "нойбургскіх уладанняў" глядзі: *Lesiński J.* Spory o dobra neuburskie // Miscellanea Historico-Archivistica. – 1996. – T. 6. – S. 95–132; *Мацук А.* Род Радзівілаў ва ўнутрапалітычным жыцці ВКЛ у 20-х – пачатку 30-х гг. XVIII ст. // Вестник Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – 2005. – №1. – С. 27–32; *Мацук А.* Радзівілы і справа аб "нойбургскіх ўладаннях" у 1730–1740-я гады // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – №3. – С. 15–21; *Мацук А.* Взаимоотношение Радзивиллов и шляхты с евреями-арендаторами в 30-ые годы XVIII ст. // Материалы Двенадцатой Ежегодной Международной Междисциплинарной конференции по иудаике, Ч. 2. – Москва, 2005. – С. 116–125; *Мацук А.* Рух пасэсараў "нойбургскіх уладанняў" // Геральд Litherland. – №17. – Гродна, 2007. – С. 26–37.

розным магнатам, але калі ніхто не пагадзіўся, то сам вырашыў распачаць справу супраць Радзівілаў у Трыбунале ВКЛ. Прускі рэзідэнт чакаў неабходныя паперы з Берліна і таму больш рэальным часам пачатку разгляда справы ў Трыбунале ВКЛ была не віленская, а руская кадэнцыя Трыбунала ВКЛ 1743 г.[40]

Гэта толькі павялічвала нярвовасць і агульныя падазрэнні ў адносінах паміж Сапегамі і Радзівіламі. Радзівілы не давяралі Сапегам і апасаліся іх саюза з Янам Тарло. Міхал Казімір Радзівіл у пачатку лютага 1743 г. быў упэўнены, што разам з прускім выступленнем магчыма і выступленне Сапег у саюзе з Янам Тарло. Ён ведаў аб існаванні якогасьці ліста Сапег да Тарло. У якім тыя прапаноўвалі сумеснае выступленне супраць «варшаўскай дамовы»* аб «нойбургскіх уладаннях» пасля смерці рэйнскага электара Карля Філіпа. Таму польны гетман ВКЛ пры пагрозах прускага караля лічыў за лепшае хутчэй скончыць перамовы з новым рэйнскім электарам Карлам Тэадорам дэ Зульцбахам.[41] Такое выступленне было вельмі апасным пры наяўнасці прускіх прэтэнзій і смерці рэйнскага электара. Ганна Радзівіл нават заяўляла, што смерць рэйнскага электара вельмі зараз некарысна. Лепей было каліб ён памёр год ці два таму «пакуль прускі кароль не быў такім моцным».[42] Звесткі аб планах Сапег у адносінах да «нойбургскіх уладанняў» і падтрымкі прускага караля толькі памнажаліся. Ужо ў канцы студзеня 1743 г. такую інфармацыю мела Францішка Уршуля Радзівіл.[43] У лютым 1743 г. ужо Барбара Радзівіл сцвярджала, што Сапегі абяцаюць адпомсціць за Алькенікі.* Збіраючца атрымаць трыбунальскі дэкрэт у справе «нойбургскіх уладанняў». Белзскі ваявода Антоні Патоцкі ад імя прускага караля зойме іх. Калі войскі ВКЛ паспрабуюць абараніць «нойбургскія ўладанні», то будуць створаны антыгетманскія канфедэрацыі. Напужаная наваградская ваевадзянка нават раіла як мага хутчэй прасіць дапамогі ў каралеўскага двара і праз расійскага сябру Лівена ў Пецярбургу.[44]

Не маглі Радзівілы вызначыцца і наконт кандыдата на трыбунальскага маршалка. Міхал Казімір Радзівіл угаворваў падскарбія ВКЛ Яна Салагуба, каб аб трыбунальскае маршалкоўства стараўся яго сын жмудскі кашталян Юзаф, але апошні адмовіўся.[45] Адначасова Радзівілы не хацелі падтрымліваць кандыдатуру Ланеўскага. Польны гетман ВКЛ жаліўся напрыканцы 1742 г. Яну Фрэдэрыку Сапезе, што Радзівілы не маюць свайго кандыдата на трыбунальскага маршалка.[46] Былі ў Радзівілаў і праблемы з канфедэнцыяльнасцю іх плана выбараў на грамнічых сойміках. Так Тэрэза Сапежанка ў сярэдзіне студзеня 1743 г. нават даведалася прыкладны план Радзівілаў на дэпутацкіх сойміках. Ён, па яе словах, выглядаў наступным чынам: надворны маршалак ВКЛ Юзаф Сцыпіон дэль Кампо (нажаль у дакуменце не захавалася інфармацыя аб вызначыным месцы сойміка), Жмудзь – азярышчанскі староста Салагуб, Коўна – наваградскі гродскі пісар Лопат, Смаленск – смаленскі канюшы Эйдзіатовіч.[47] Можна меркаваць, што сапраўды план быў аўтэнтычны, але адносіўся да ранейшых часоў, калі Радзівілы яшчэ спрабавалі ўгаварыць старацца аб трыбунальскім маршалкоўстве Юзафа Салагуба.

Сапегам, таксама, не ўдалося схаваць, што лоўчы ВКЛ збіраецца старацца аб дэпутацтве і трыбунальскім маршалкоўстве. Ужо ў пачатку лістапада 1742 г. Барбара Радзівіл была папярэджана адным, нажаль нам невядомых, удзельнікаў кааліцыі аб небяспецы для Радзівілаў пад час выбараў на будучы Трыбунал ВКЛ.[48] Радзівілы на ўсіх сойміках падалі пратэсты супраць магчымага абрання Міхала Антонія Сапегі.[49] Аднак, Сапега, карыстаючыся дапамогай прыхільнага Чартарыйскім шляхецкага рода Аскеркаў, быў абраны дэпутатам на мазырскім сойміку. Як задаволена заявіў на гэтую навіну Юзаф

* Дамова ў Варшаве (5 красавіка 1732 г.) паміж Радзівіламі і Сапегамі. Згодна яе, Сапегі адмаўляліся ад усіх прэтэнзій да "нойбургскіх уладанняў" за 2 мільёны чырвоных злотых.

Станіслаў Сапега: «Хаця майго брата паўсюль пільнавалі Радзівілы, аднак дзякуючы дапамозе мазырскага старосты Аскеркі стаў дэпутатам з Мазыра».[50] Удалося гэта, дзякуючы хітрасці. Мазырскія соймікі адбываліся на двары мазырскага старосты. Той (Людвік Гервазі Аскерка) на вызначыны для сойміка час прызначыў танцы. Радзівілаўскія прыхільнікі палічылі гэта за адмову ад сойміка і разышліся. Тады мазырскі маршалак Рафал Аскерка прыпыніў на некаторы час танцы, распачаў соймік і вызначыў дэпутатамі: Міхала Антонія Сапегу і грэбніцкага старосту Томаша Ленкевіча.[51]

Астатнія соймікі таксама скончыліся на карысць Сапег. На берасцейскім, ковенскім, ашмянскім сойміках дэпутатамі былі абраны сапежынскія прыхільнікі.[52] У Брэсце пасля доўгіх спрэчак удалося абраць дэпутатамі Юзафа Сасноўскага і Францішка Лахоўскага. Нечакана для Міхала Антонія Сапегі не быў сарваны гарадзенскі соймік і дэпутатамі сталі, на думку лоўчага ВКЛ, варожыя Сапегам шляхціцы.[53] Міхал Масальскі пераконваў, што ў Гродне былі абраны прыхільныя дэпутаты гарадзенскі мечнікович Караль Храптовіч і ваўкавыскі стальніковіч Тадэвуш Юндзіл. Апошняму Масальскі прасіў, каб дасталося маршалкоўства Духоўнага Трыбунала.[54] Радзівілаўскія прыхільнікі занеслі ў ваўкавыскія гродскія кнігі пратэстацыі супраць абраных дэпутатаў у Гародне.[55] Барбара Радзівіл пераконвала не дапускаць Юндзіла, бо той прыяцель Сасноўскага і Пшаздзецкага, а ў крайнім выпадку раіла Міхалу Казіміру Радзівілу пакінуць канчатковае рашэнне для «гандля» пад час рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ.[56] Акрамя таго, Масальскі паведамляў, што ў Троках «незважаючы на пратэстацыі, наміміравана дэпутатаў, супраць якіх і тут у Гародне шляхта занесла пратэстацыю і другія да Коўна накіраваліся».[57] Дэпутатамі з пратэстамі былі абраны прыхільнікі Радзівілаў троцкі падваявода і троцкі цівун Андрэй Уладзіслаў Укольскі і смаленскі войскі Павал Кашыц.[58] Не дапамог кааліцыянтам і шляхціц Канарскі. Наадварот Канарскі замест дапамогі аддаў ліст Міхала Чартарыйскага з просьбай сарваць троцкі соймік радзівілаўскаму саюзнік троцкаму ваяводзе Аляксандру Пацею.[59] У Ашмяне дэпутатамі былі абраны сапежынскія прыхільнікі ашмянскі войскі Караль Суліструоўскі і ашмянскі стражнік Францішак Ракіцкі, але Радзівілы сцвярджалі, што яны абраны нелегітымна, бо соймік адбыўся ў тры гадзіны ночы.[60] Лоўчы ВКЛ быў упэўнены, што выбарам дэпутатаў скончыцца і пінскі соймік, бо на ім збіраўся быць Міхал Вішнявецкі. Такжа меркаваў і Міхал Чартарыйскі, які лічыў, што там будзе абраны і кандыдат Радзівілаў на трыбунальскае маршалкоўства. У выніку сапраўды пінскі соймік скончыўся выбарам дэпутатаў пінскага войскага і пінскага гродскага пісара Антонія Арэшкі і пінскага падкаморыча Стэфана Кужэнецкага. Апошні быў прыхільнікам наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла, а Арэшка, напэўна, з'яўляўся прыхільнікам Вішнявецкага.[61] У той жа час ніводны з іх не мог быць радзівілаўскім кандыдатам. Удалося правесці выбар радзівілаўскіх прыхільнікаў кашаньскага старосты Гераніма Жабы і смаленскага канюшага Тадэуша Эйдзіатовіча і на смаленскім сойміку, але супраць іх выбару былі занесены пратэстацыі.[62] На старадубскім сойміку без пратэстаў дэпутатамі былі абраны старадубскі войскі Антоні Андрэй Стравінскі і старадубскі земскі пісар Рыгор Антоні Гімбут.[63] Ваўкавыскі, мінскі, лідскі, слонімскі і віленскі былі сарваны.[64] На апошнім вялікую дапамогу Юзафу Станіславу Сапезе аказалі прыхільнікі Міхала Чартарыйскага.[65] Таксама быў сарваны і наваградскі соймік. На ім удалося толькі абраць дырэктарам сойміка Хэлхоўскага, які «як хутка сеў, падзякаваўшы і развітаўся яшчэ хутчэй».[66]

Юзаф Станіслаў Сапега лічыў перамогу Сапег пераканаўчай. Сярод галоўных сваіх прыхільнікаў сярод дэпутатаў віленскі каад'ютар называў Буржыньскага з Коўна, Суліструоўскага з Ашмян, Сасноўскага з Брэста. Увогуле «з розных мест шмат сапежынскіх прыяцеляў».[67] Юры Феліцыян Сапега лічыў, што Міхал Антоні Сапега

дакладна стане трыбунальскім маршалкам, бо «саперніка, у другога бока ня бачу».[68] Быў вельмі задаволены як скончыліся грамнічыя соймікі і іншы лідэр кааліцыі Міхал Масальскі, бо дэпутатамі былі абраны Міхал Антоні Сапега з Мазыра і Станіслаў Буржыньскі з Коўна і «з іншых месц шмат абрана прыхільнікаў». На яго думку трэба было чакаць рэакцыі Міхала Вішнявецкага, што не ўдалося выбраць магната, які мог бы быць канкурэнтам на трыбунальскае маршалкоўства з Міхалам Антоніям Сапегам.[69] Міхал Чартарыйскі, таксама, не бачыў канкурэнтаў Сапеге на трыбунальскае маршалкоўства сярод абраных дэпутатаў. Падканцлер ВКЛ лічыў, што галоўная барацьба разгарнецца ў справе допуску ў лік трыбунальскіх суддзяў смаленскіх дэпутатаў, якія абраны з вялікай колькасцю пратэстаў. Адначасова Чартарыйскі лічыў магчымым допуск старадубскіх дэпутатаў супраць якіх былі з большага сфабракаваныя пратэстацыі. Разлічваў падканцлер ВКЛ і на прыхільнасць аднаго з іх – старадубскага войскага Антонія Стравінскага, якому дапамог атрымаць уладзіслаўскае войтаўства ў юрбарскім старостве.[70]

Зусім іншы настрой панаваў сярод Радзівілаў. Ганна Радзівіл атрымаўшы вынікі грамнічых соймікаў у лісце да сына Міхала Казіміра зрабіла выснову, што ў паразе на грамнічых сойміках вінаваты яе другі сын Геранім Фларыян Радзівіл. «Прышла пошта і прынесла мне рэестр дэпутатаў, паміж якімі найперш Ягомосць Пан лоўчы і цэлы будучы Трыбунал, усё крэатуры і слугі сапежынскія. Ужо тады мой дзяцёнак мала маеш што рабіць у Літве, бо непадобна будзе таму перашкодзіць. Так тое знаходжанне майго сына князя падчашага ў Слуцку зрабіла, што ніводны такі непрактыкаваўся Трыбунал, бо калі я часам там знаходзілася, то старалася і дзейнічала разам з вамі ўсімі; рабіла ўсё, што магла, меўшы па ўсім ваяводствах і паветах свае крэатуры, а зараз усіх прагнана з сваім прыгожым саветнікам, нават і жонку і мяне матку аддаліў, адкуль прывёў і Дом і сябе самога да апошняй пагібелі. А за тым мой дзяцёнак праз міласць Боскую нятрэба даць упасць і яму і інтарэсам цэлага Дома».[71] Вельмі незадаволена была і Барбара Радзівіл, якая яшчэ перад соймікамі папярэджвала аб небяспецы з боку мазырскага сойміка і прасіла, каб Геранім Фларыян Радзівіл даслаў для яго зрыву Збароўска, які павінен быў аб’яднацца для гэтага з радзівілаўскімі прыхільнікамі Яленскімі.[72] Францішка Уршуля Радзівіл наадварот абвінавачвала ва няўдачы наваградскую ваевадзянку Барбару Радзівіл, бо папярэдзіла яе аб небяспецы ў Мазыры, а тая ўпэўніла яе, што прадпрыняла усе магчымыя дзянні для перашкоды Сапегам.[73]

У склаўшайся сітуацыі, калі Сапегі мелі большасць сярод дэпутатаў і свайго кандыдата на трыбунальскае маршалкоўства, а Радзівілы не, то апошнім заставалася спадзявацца, што ўдасца не дапусціць Міхала Антонія Сапегу ў лік трыбунальскіх суддзяў. Барбара Радзівіл лічыла яго нелегітымна абраным дэпутатам, бо соймік адбыўся пад кіраўніцтвам Аскерак у тры гадзіны начы. Яна нават са складанасцю, але знайшла шляхту гатовую супраць гэтага пратэставаць, бо «вялікімі грашыма адрываюць».[74] У выніку супраць выбараў Міхала Антонія Сапегі на мазырскім сойміку было занесена шмат пратэстацый у іншых гродах.[75]

У такой сітуацыі ўсё залежыла наколькі кааліцыя адзіна і можа разлічваць на прыхільнае стаўленне каралеўскага двара. Вялікую падтрымку ў гэтым пытанні Міхал Антоні Сапега атрымаў з боку свайго саюзніка падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Ужо 20 лютага 1743 г. падканцлер ВКЛ напісаў Міхалу Антонію Сапезе ліст з віншаваннямі з выбарам мазырскім дэпутатам. Рабіў выснову, што ніхто з абраных дэпутатаў не можа быць канкурэнтам на трыбунальскае маршалкоўства і заўважаў, што прыхільнікі кааліцыі маюць значную большасць сярод абраных дэпутатаў. Разумеў непакой Сапегі з-за магчымых перашкод з боку Радзівілаў і раіў самому Сапезе звярнуцца да гетманаў з просьбай падтрымаць яго кандыдатуру на трыбунальскае маршалкоўства. Са

свайго боку заявіў, што ўжо данёс каралю, што Сапега мае найбольшыя шанцы стаць трыбунальскім маршалкам, бо мае ў падтрымку галасы амаль усіх абраных дэпутатаў. Падсумоўваючы Чартарыйскі прасіў каралеўскай падтрымкі для Міхала Антонія Сапегі.[76] 2 сакавіка 1743 г. Міхал Чартарыйскі зноў напісаў з Варшавы ліст да Міхала Антонія Сапегі. У ім ён пераконваў лоўчага ВКЛ у сваёй падтрымцы. Заяўляў, што напісаў на каралеўскі двор ліст у падтрымку Міхала Антонія Сапегі і абвінавачваннямі Радзівілаў, што тыя спецыяльна распаўсюджваюць чуткі, як і ў 1741 г., аб антыкаралеўскіх планах Сапег па стварэнню канфедэрацый.[77] Лічыў, што не мае законнай моцы сфабрыкаваная пратэстацыя супраць мазырскага сойміка, якая была пададзена ў трыбуналтскія кнігі. Абяцаў, што на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ ад каралеўскага двара будзе прысутнічаць Юры Флемінг, які будзе дзейнічаць у інтарэсах свайго прыяцеля Міхала Чартарыйскага, а адпаведна і кааліцыянтаў. Чартарыйскі раіў Сапезе напісаць лісты з просьбай аб падтрымцы да караля, першага міністра Бруля, прымаса, кардынала, каронных канцлера і падканцлера. Таксама лісты да іх і ксёндза Гварыні, каб даслаў віленскі каад'ютар Юзаф Станіслаў Сапега.[78] Міхал Антоні хутка выканаў параду падканцлера ВКЛ і выслаў лісты да караля, першага міністра Бруля, прымаса, ксяндза Гварыні.[79]

Вялікае значэнне для далейшай перамогі магнацкай кааліцыі мела дзейнасць на каралеўскім двары падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. 23 сакавіка 1743 г. падканцлер ВКЛ напісаў Юзафу Станіславу Сапезе, што каралеўскі двор задумаўся падтрымліваць, ці не кандыдатуру лоўчага ВКЛ на трыбунальскае маршалкоўства пасля таго, як з'явіліся чуткі, што яго маршалкоўства шчыльна звязана з прэтэнзіямі прускага караля Фрыдрыха II на «нойбургскія ўладанні». Чартарыйскі пераконваў у памылковасці такіх чутак і ручаўся за лоўчага ВКЛ перад каралём.[80] 30 сакавіка 1743 г. Міхал Чартарыйскі напісаў да Міхала Антонія Сапегі Міхал, што атрымаў з каралеўскага двара навіны, што генерал артылерыі ВКЛ Юры Флемінг Аўгустам III вызначаны пасрэднікам у справе будучага Трыбунала ВКЛ.[81] Адначасова падканцлер ВКЛ заяўляў, што пісаў і будзе пісаць да сваіх прыхільнікаў, каб яны дапамаглі Сапезе стаць трыбунальскім маршалкам, а інстыгатару ВКЛ Буржыньскаму – пісарам віленскай кадэнцыі. Паўтараў ён і свае просьбы да лоўчага ВКЛ у справе падтрымкі інстыгатара ВКЛ да віленскага пяра.[82] Іншы ўдзельнік кааліцыі Юры Феліцыян Сапега лічыў, што асноўная барацьба разгарнецца за віленскае пяро і канкурэнтамі да яго будуць, апрача Буржыньскага, ашмянскія і троцкія дэпутаты. Сам мсціслаўскі ваявода, таксама, пісаў да сваіх прыхільнікаў у падтрымку за ковенскім дэпутатам і інстыгатарам ВКЛ Станіславам Буржыньскім.[83] Кандыдатура таго катэгарычна не задавальняла Радзівілаў і таму Вішнявецкі праз Агінскіх стараўся паўплываць на Сапег, каб пісарам віленскай кадэнцыі стаў іншы сапежынскі прыхільнік ашмянскі дэпутат і ашмянскі войскі Караль Сулістроўскі.[84] Апошні імкнуўся атрымаць такую падтрымку на віленскае пісарства і ад саміх Сапег.[85]

Зноў перамозе кааліцыі на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ мог перашкодзіць толькі вялікі гетман ВКЛ і віленскі ваявода Міхал Вішнявецкі. Той, праўда, ужо ў канцы сакавіка 1743 г. сустрэўшы ў Слоніме стольніка ВКЛ Пятра Сапегу заявіў, што не будзе супраць кандыдатуры лоўчага ВКЛ да трыбунальскага маршалкоўства. Заяўляў, што не дась Міхалу Казіміру і Мікалаю Фаўстыну Радзівілам «кроў разліць».[86]

У той жа час уся радзівілаўская групоўка знаходзілася пад моцным уражаннем пратэста прускага рэзідэнта Карла Гофмана супраць дамовы Раддзівілаў і рэйнскага электара аб «нойбургскіх уладаннях», бо яна заключана была без уліку правоў прускага караля. Гэты пратэст 20 лютага 1743 г. быў накіраваны да прымаса Крыштафа Шэмбека і да іншых сенатараў. У выніку Радзівілы для выпрацавання крокаў супраць прускіх прэтэнзій у пачатку сакавіка 1743 г. сабраліся на родавую нараду ў Бялай. Прускі кароль

патрабаваў за свае правы на «нойбургскія ўладанні» выплаты ста дваццаці тысяч дукатаў, потым зменьшыў іх да ста тысяч. А 23 сакавіка 1743 г. праз свайго прадстаўніка Бекерса заявіў, што задаволіцца нават і пяцідзесяцці тысячамі фларэнаў. Ганна Радзівіл не хацела плаціць і такой суммы і сцвярджала, што такія фінансавыя патрабаванні Фрыдрыха II зроблены толькі з мэтай, каб прывесці да ўпадку Радзівілаў.[87]

Радзівілы, таксама, збіралі ўсе свае сілы.[88] Яны спрабавалі пераканаць караля, што перавага Сапегаў у Трыбунале дасць магчымасць апазіцыі стварыць канфедэрацыю ў Княстве супраць Вецінаў. Міхал Чартарыйскі даказаў каралю, што распаўсюджаныя Радзівіламі чуткі не адпавядаюць рэчаіснасці. У выніку Радзівілы былі вымушаны пагадзіцца, што трыбунальскім маршалкам стане Міхал Антоні Сапега.[89] Каралеўскі двор уважліва сачыў у той момант за сітуацыяй у ВКЛ, бо баяўся, што апазіцыя кандыдатуры Міхала Антонія Сапегі пойдзе на стварэнне канфедэрацыі.[90]

Крыху супакоіў Радзівілаў ліст у канцы красавіка 1743 г. прадстаўніка рэйнскага электара, які заявіў, што прускі кароль згодны за сто тысяч рэйнскіх злотых скончыць справу з Радзівіламі і рэйнскім электарам.[91] Такім чынам, паменшылася пагроза, што Сапегі ад імя прускага караля і рэйнскага электара могуць распачаць справу ў Трыбунале ВКЛ 1743 г. Аднак заставаліся нявырашнымі справы Сапег з любашаньскімі і бускімі старостамі таму не было ніякай мовы пра прымірэнне Сапег і Радзівілаў.

Было зразумела, што ў такой сітуацыі перамовы Сапег з вялікім гетманам ВКЛ Міхалам Вішнявецкім аб будучым трыбунальскім маршалку будуць цяжкімі. У пачатку красавіка 1743 г. сам Міхал Антоні Сапега прыбыў у Мерач, каб асабіста пераканаць Міхала Вішнявецкага падтрымаць яго кандыдатуру на трыбунальскае маршалкоўства і таму не перашкаджаць прызнанню легітымным яго выбару на мазырскім сойміку. Спачатку лоўчы ВКЛ меў размову з прадстаўніком вялікага гетмана ВКЛ Даманскім. Ён паспрабаваў пераканаць яго, што несапраўдныя звесткі Вішнявецкага, што Сапега хоча стаць трыбунальскім маршалкам па просьбе прускага караля, каб распачаць справу аб «нойбургскіх уладаннях». Акрамя таго, Міхал Антоні Сапега папярэдзіў, што калі яго выбар не будзе прызнаны легітымным, то і іншыя дэпутаты не будуць дапушчаны ў лік трыбунальскіх суддзяў, бо амаль супраць усіх соймікаў былі занесены пратэсты. У такім выпадку не адбудзецца Трыбунал ВКЛ, што можа і пацягнуць за сабой шляхецкія выступленні. З усімі думкамі Сапегі Даманскі пагаджаўся і заяўляў, што Вішнявецкі падтрымае выбар трыбунальскім маршалкам лоўчага ВКЛ.[92] Пасля доўгіх перамоў Даманскага з Вішнявецкім і сам Міхал Антоні Сапега быў запрошаны на размову з вялікім гетманам ВКЛ. Той заявіў, што падтрымлівае кандыдатуру Сапегі, але супраць яе Радзівілы, якія лічаць, што лоўчы ВКЛ хоча стаць трыбунальскім маршалакам па просьбе прускага караля. І такая просьба была зроблена пад час побыту Міхала Антонія Сапегі ў Берліне. Міхал Антоні Сапега запярэчыў і лёгка даказаў, што не быў у Берліне. Больш таго заявіў, што калі нават прускі кароль думаў распачаць судовую справу аб «нойбургскіх уладаннях», то яна не магла распачацца так хутка, а, акрамя таго, яна павінна разглядацца на сойме Рэчы Паспалітай, а не на Трыбунале ВКЛ. З гэтай прычыны Сапега, калі будзе трыбунальскім маршалкам, то адмовіцца разглядаць справу на Трыбунале ВКЛ. Вішнявецкі быў задаволены адказам, абяцаў перадаць яго Радзівілам і хацеў правесці яшчэ адну нараду перад самой рэасумпцыяй Трыбунала ВКЛ у Вільне.[93]

Міхалу Антонію Сапеге ўдалося праз сваёго шпіёна даведацца, што Міхал Вішнявецкі вельмі незадаволены падзелам спадчыны з Міхалам Казімірам Радзівілам пасля смерці свайго брата Януша Вішнявецкага (16 студзеня 1741 г.) і нават у размове са сваёй жонкай Тэкляй з Радзівілаў абяцаў «расправіцца» і хацеў паказаць, што «не іх [Радзівілаў – *А.М.*] думкамі, але сваёй павагай фарміруе Трыбуналы». Менавіта таму падтрымае кандыдатуру

Сапегі да трыбунальскага маршалкоўства.[94] Лоўчы ВКЛ падсумоўваючы свае думкі пасля побыту ў Вішнявецкага рабіў выснову, што той станоўча адносіцца да яго кандыдатуры на трыбунальскага маршалка. Тым больш ад свайго шпіёна Міхал Антоні Сапега даведаўся, што Міхал Казімір Радзівіл, таксама, лічыць, што вялікі гетман ВКЛ невельмі прыхільны Сапегам, але пагадзіцца, каб лоўчы ВКЛ быў трыбунальскім маршалкам.[95]

Жонка Міхала Вішнявецкага Тэкля разумела, што ніхто не перашкодзіць лоўчаму ВКЛ стаць трыбунальскім маршалкам і таму паспрабавала атрымаць яго згоду, каб маршалкам Скарбовага Трыбунала быў упіцкі дэпутат Томаш Страшэвіч. Аднак Міхал Антоні Сапега не даў адназначнага адказу на гэтую просьбу.[96] Ды і ў саміх Радзівілаў не было згоды наконт размеркавання трыбунальскіх урадаў. Так наваградская ваевадзянка Барбара Радзівіл прапаноўвала сваім родзічам нясвіжскім Радзівілам, каб маршалкам Скарбовага Трыбунала быў абраны іншы радзівілаўскі прыхільнік кашаньскі староста Геранім Жаба.[97]

Перад рэасумпцыяй Трыбунала ВКЛ Міхал Чартарыйскі імкнучыся ўзмацніць пазіцыі кааліцыі праводзіў перамовы з падскарбіям ВКЛ Янам Салагубам. Падканцлер ВКЛ прапаноўваў Салагубу дзейнічаць на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ у саюзе з іншымі ўдзельнікамі кааліцыі.[98]

Нягледзячы на згоду вялікага і польгана гетманаў ВКЛ Міхал Антоні Сапега не давяраў Радзівілам і з дапамогай шляхты збіраўся даказваць правамоцнасць свайго выбару дэпутатам. Таму прасіў брата напісаць да шляхціца Путкамера, каб той прыехаў на рэасумпцыю са сваімі прыяцелямі. Акрамя таго, напісаць да інстыгатара ВКЛ Станіслава Буржыньскага, каб той прасіў шляхціца Дамброўскага прывесці прыяцеляў з Вількамірскага павета. Таксама разлічваў, што надворны падскарбі Юры Францішак Сапега прывядзе шляхту з Брэсцкага ваяводства.[99] Вялікае значэнне напярэдадні рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ Міхал Антоні Сапега надаваў прымірэнню з віленскім цівуном Тышкевічам, як першым ураднікам віленскага ваяводства. Аб пасрэдніцтве ў гэтай справе ён прасіў свайго брата Юзафа Станіслава Сапегу.[100] Напэўна, невыключаў лоўчы ВКЛ, што Вішнявецкі з-за хваробы зноў не будзе на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ і тады вялікую вартасць будзе мець галасы віленскіх ураднікаў.

Рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ прайшла ў барацьбе паміж магнацкай кааліцыяй і Радзівіламі. На рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ з’ехаліся з аднаго боку лоўчы ВКЛ Міхал Антоні, віленскі каад’ютар Юзаф Станіслаў, смаленскі ваявода Пётр, мсціслаўскі ваявода Юры Феліцыян Сапегі і троцкі кашталян Міхал Масальскі, а з другога боку вялікі гетман ВКЛ Міхал Вішнявецкі, польны гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл, падчашы ВКЛ Геранім Фларыян Радзівіл і іншыя Радзівілы. Радзівілы прыбылі ў суправаджэнні значнай колькасці войск. З найбольшым прыватным войскам прыбыў падчашы ВКЛ. Прычынай такой мабілізацыі войск было тое, што Геранім Фларыян быў перакананы, што Міхал Антоні Сапега, калі стане трыбунальскім маршалкам, то падтрымае прэтэнзіі прускага караля на «нойбургскія уладанні». Разам са справай любашаньскіх старостаў яна з’яўлялася прычынай, па якой Радзівілы не хацелі дапускаць Міхала Антонія Сапегі ў лік трыбунальскіх суддзяў.[101]

Магчымаму кравапраліццю на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ перашкодзіў прыбыўшы каралеўскі прадстаўнік генерал артылерыі ВКЛ Юры Флемінг, які меў каралеўскую экспедыцыю ў падтрымку кандыдатуры лоўчага ВКЛ да трыбунальскага маршалкоўства. Такая пазіцыя Аўгуста III фактычна вызначыла перамогу Сапег, бо Радзівілы не маглі супрацьдзейнічаць Міхалу Антонію Сапезе, каб не сапсаваць адносіны з каралеўскім дваром. Прычынай такога прыхільнага стаўлення караля да лоўчага ВКЛ, па словах Юзафа Станіслава Сапегі, было тое, што тая экспедыцыя была зроблена на каралеўскім

двары падканцлерам ВКЛ Міхалам Чартарыйскім.[102] У выніку трыбунальскім маршалкам стаў Міхал Антоні Сапега, а пісарам віленскай кадэнцыі Станіслаў Буржыньскі. Перамога Сапегаў у гэтых двух пытаннях была сапсавана тым, што Радзівілы не дапусцілі ў лік суддзяў сапежынскіх прыхільнікаў ашмянскіх і брэсцкіх дэпутатаў супраць выбару якіх існавалі сфальшаваныя пратэсты. Сапегі, аднак, не збіраліся пагаджацца на гэта. Масальскі напісаў ліст да Міхала Чартарыйскага ў якім інфарміраваў, што вялікая колькасцьураднікаў і шляхты Брэсцкага ваяводства выказала сваю незадаволенасць на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ з-за таго, што легітымна абраныя брэсцкія дэпутаты не былі дапушчаны ў лік трыбунальскіх суддзяў з-за сфальшаванай пратэстацыі. Брэсцкая шляхта заяўляла, што звернецца да караля, які заняты еўрапейскімі справамі і не звяртае ўвагі на парушэнні закона ў Рэчы Паспалітай.[103] Гэтым зваротам магнацкая кааліцыя фактычна абвінавачвала Радзівілаў перад каралём, што менавіта тыя імкнуцца да выступлення шляхты ў ВКЛ, а не Сапегі, якіх яны абвінавачвалі.

Напісаў Масальскі і да іншага ўплывовага на каралеўскім двары магната вялікага кароннага пісара Ўладзіслава Любеньскага аб паспяховай рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. Падаваў інфармацыю, што трыбунальскім маршалкам быў абраны лоўчы ВКЛ Міхал Антоні Сапега, маршалкам Духоўнага Трыбунала – Тадэвуш Юндзіл, маршалкам Скарбовага Трыбунала – упіцкі войскі Томаш Страшэвіч, пісарам літоўскай кадэнцыі – інстыгатар ВКЛ Станіслаў Буржыньскі, пісарам рускай кадэнцыі – старадубскі земскі пісар Рыгор Антоні Гімбут. Зноў асабліва звяртаў увагу Любеньскага, што, нягледзячы на раней распаўсюджаныя некаторымі чуткі рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ скончылася спакойна і агульнай згодай.[104] Зразумела, што пад «некаторымі» разумеліся Радзівілы, што зноў выстаўляла тых у непрывабным выглядзе на каралеўскім двары.

У такой сітуацыі допуск брэсцкіх і ашмянскіх дэпутатаў выглядаў як спроба супакоіць настроі шляхты. Яшчэ 17 мая 1743 г. Міхал Антоні Сапега паведамляў Юзафу Францішку Сапезе, што ашмянскія і брэсцкія дэпутаты яшчэ не былі дапушчаны ў лік трыбунальскіх суддзяў, бо трэба было супакоіць непрыхільных гэтаму дэпутатаў. Міхал Антоні Сапега быў упэўнены, што хутка трыбунальскім рашэннем дапусцяць іх у лік трыбунальскіх суддзяў.[105] І сапраўды зрабіў гэта пасля ад'езда Міхала Вішнявецкага і Міхала Казіміра Радзівіла. Адзінае, што Сапегі апасаліся незадаволенасці Чартарыйскага. Масальскі пераконваў іх, што Міхал Чартарыйскі падтрымае рашэнне Сапегі, бо сам быў незадаволены, што не быў прызнаны легітымным выбар у Брэсце Юзафа Сасноўскага.[106] Пасля атрымання інфармацыі аб допуску ашмянскіх і брэсцкіх дэпутатаў Міхал Чартарыйскі павіншаваў Сапег з такімі дзеяннямі і абяцаў пераконваць на каралеўскім двары, што гэта не робіцца для стварэння канфедэрацыі. Адначасова падканцлер ВКЛ і мазавецкі ваявода Станіслаў Панятоўскі нават стараліся для ордэн для Міхала Антонія Сапегі. Адначасова раіў Сапегам самім звярнуцца з такой просьбай да караля, Бруля, кароннага канцлера Залускага і ксёндза Гварыні.[107] У адказ на допуск ашмянскіх і брэсцкіх дэпутатаў Радзівілы абвінавачвалі Сапег, што большасць у трыбунальскім коле патрэбна, каб прыпыніць паседжанні Трыбунала ВКЛ і стварыць антыкаралеўскую канфедэрацыю. Акрамя таго, Радзівілы пагражалі, што Сасноўскі страціць магчымасць быць трыбунальскім суддзёй, бо яго як вайскоўца гетман пакліча сваім ардынансам да харугвы.[108] Удзельнікі кааліцыі ўзняліся ў абарону Сасноўскага, а Міхал Антоні Сапега нават лічыў, што Сасноўскага трэба не толькі абараніць, але фінансава ўзнагародзіць яго віцэ-маршалкоўства і пастарацца для яго аб урадах.[109] У такой сітуацыі радзівілаўскія планы не мелі поспеху.

Такім чынам, толькі дапамога Фаміліі прынесла перамогу Сапегам над Радзівіламі ў Трыбунале ВКЛ 1743 г. Прыхільнікі Фаміліі падтрымлівалі «сапежынцаў» на грамнічных

сойміках і ў барацьбе вакол трыбунальскіх урадаў. Галоўнай была дапамога падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага на каралеўскім двары, што дало магчымасць атрымаца падтрымку Аўгуста III для кандыдатуры Міхала Антонія Сапегі на ўрад маршалка Трыбунала ВКЛ 1743 г. Каралеўская падтрымка прымусіла сасаступіць вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводу Міхала Вішнявецкага і ўрад трыбунальскага маршалка дастаўся Міхалу Антонію Сапезе, што азначала поўную перамогу ў барацьбе за кантроль над Трыбуналам ВКЛ 1743 г. кааліцыі Сапег, Чартарыйскіх і Масальскіх над магнацкай групоўкай Радзівілаў.

---

[1] Biblioteka Narodowa (BN), Biblioteka Ordynacji Zamojskich (BOZ) 941, k. 370; Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD), Archiwum Radziwiłłów (AR), dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 15.09.1742, Дзятлава, k. 162.

[2] BN, BOZ 941, k. 370.

[3] Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka (LMAB) f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 03.11.1742, Навагрaдак, l. 27 v–28 v.

[4] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 15.09.1742, Дзятлава, k. 162.

[5] LMAB f. 139, op. 1, b. 4040, Ю.С. Сапега да М.А. Сапегі, 27.11.1742, Коўналішкі, l. 2–3.

[6] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 09.11.1742, Навагрaдак, l. 26.

[7] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 09.11.1742, Навагрaдак, l. 26.

[8] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 22.12.1742, Варшава, l. 5.

[9] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.12.1742, Боцкі, l. 2.

[10] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.12.1742, Боцкі, l. 2 v.

[11] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 15.09.1742, Дзятлава, k. 162.

[12] AGAD, AR, dz. IV, teka 50, koperta 663, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 31.01.1743, Нясвіж, k. 144.

[13] BN, BOZ 941, k. 370–371.

[14] BN, BOZ 941, k. 371.

[15] LMAB f. 139, op. 1, b. 4040, Ю.С. Сапега да М.А. Сапегі, 19.01.1743, Вільня, l. 4–5 v.

[16] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 05.12.1742, Дзятлава, k. 181.

[17] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 10.01.1743, Чарлёна, l.143 v.

[18] AGAD, AR, dz. IV, teka 50, koperta 663, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 12.02.1743, Нясвіж, k. 146.

[19] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Я.Ф. Сапега да Ю.С. Сапегі, 19.12.1742, Кодань, l. 13–13 v.

[20] AGAD, AR, dz. V, 13831, cz. 7, Я.Ф. Сапега да М.К. Радзівіла, 16.11.1742, Дарагастаі, k. 190.

[21] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Я.Ф. Сапега да Ю.С. Сапегі, 25.11.1742, Дарагастаі, l. 21.

[22] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Я.Ф. Сапега да Ю.С. Сапегі, 12.02.1743, Кодань, l. 125–125 v.

[23] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.12.1742, Боцкі, l. 3.

[24] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 22.12.1742, Варшава, l. 5.

[25] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 19.01.1743, Варшава, l. 42.

[26] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Юры Феліцыян Сапега да Ю.С. Сапегі, 26.01.1743, Ляхавічы, l. 133–133 v.

[27] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 15.01.1743, Чарлёна, l. 140.

[28] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 13.01.1743, Чарлёна, l. 134.

[29] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 10.01.1743, Чарлёна, l. 143 v.

[30] LMAB, f. 139, b. 2711, М. Масальскі да Ю.С. Сапегі, 22.01.1743, Вяйсеі, l. 73–73 v.

[31] LMAB f. 139, b. 3607, А. Пшаздзецкі да Ю.С. Сапегі, 21.01.1741, Чарлёна, l. 31.

[32] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 18.02.1743, Навагрaдак, k. 203.

[33] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 12.01.1743, Варшава, l. 41.

[34] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 19.01.1743, Варшава, l. 42.

[35] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, M.A. Сапега да Ю.С. Сапегі, 10.01.1743, Чарлёна, l. 143 v.
[36] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Тэрэза Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.01.1743, Янаў, l. 128.
[37] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, M.A. Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.12.1742, Боцкі, l. 2 v–3.
[38] AGAD, AR, dz. IV, teka 50, koperta 663, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 12.02.1743, Нясвіж, k. 146.
[39] AGAD, AR, dz. IV, teka 45, koperta 630, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 22.11.1742, Бяла, k. 9.
[40] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, M.A. Сапега да Ю.С. Сапегі, 27.12.1742, Боцкі, l. 2.
[41] AGAD, AR, dz. IV, teka 30, koperta 421, М.К. Радзівіл да г. Радзівіл, 09.02.1743, Берцяны, k. 38.
[42] AGAD, AR, dz. IV, teka 45, koperta 630, г. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 17.01.1743, Бяла, k. 31.
[43] AGAD, AR, dz. IV, teka 50, koperta 663, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 31.01.1743, Нясвіж, k. 144.
* Маецца на ўвазе параза сапежынскіх атрадаў ад войск "рэспубліканцаў" пад Алькенікамі (18 лістапада 1700 г.).
[44] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 193; AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 18.02.1743, Наваградак, k. 197.
[45] AGAD, AR, dz. IV, teka 30, koperta 421, М.К. Радзівіл да Я.Ф. Сапегі, 19.12.1742, Жолква, k. 22. AGAD, AR, dz. V, 13831, cz. 7, Я.Ф. Сапега да М.К. Радзівіла, 16.11.1742, Дарагастаі, k. 190.
[46] AGAD, AR, dz. IV, teka 30, koperta 421, М.К. Радзівіл да Я.Ф. Сапегі, 19.12.1742, Жолква, k. 22–23.
[47] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, T. Сапега да Ю.С. Сапегі, 19.01.1743, Янаў, l. 139.
[48] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 12.11.1742, Наваградак, k. 178.
[49] *Zielińska T.* Więź rodowa domu Radziwiłłowskiego w świetle diariusza Michała Kazimierza Radziwiłła «Rybieńki" // Miscellanea Historico-Archivistica. – 1989. – T. 3. – S. 189.
[50] BN, BOZ 941, k. 372.
[51] *Matuszewicz M.* Diariusz życia mego, 2 toma. – Warszawa, 1986. – T. 1, S. 202–204.
[52] *Matuszewicz M.* Diariusz życia mego, 2 toma. – Warszawa, 1986. – T. 1, S. 202–204, 206, 211.
[53] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, M.A. Сапега да Ю.С. Сапегі, 12.02.1743, Боцкі, l. 123.
[54] LMAB, f. 139, b. 2711, M. Масальскі да Ю.С. Сапегі, 11.02.1743, Вяйсеі, l. 71–71 v.
[55] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), фонд 1710, вопіс 1, справа 13, apk. 1079–1080.
[56] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, б. д., б. м., k. 188.
[57] LMAB, f. 139, b. 2711, M. Масальскі да Ю.С. Сапегі, 11.02.1743, Вяйсеі, l. 71–71 v.
[58] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192.
[59] LMAB f. 139, b. 4982, M. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 16.02.1743, Варшава, l. 47.
[60] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 191.
[61] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192; LMAB f. 139, b. 4982, M. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 16.02.1743, Варшава, l. 47.
[62] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192.
[63] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192.
[64] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, M.A. Сапега да Ю.С. Сапегі, 12.02.1743, Боцкі, l. 123–123 v; LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Я.Ф. Сапега да Ю.С. Сапегі, 12.02.1743, Кодань, l. 125–125 v; LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Я.Ф. Сапега да Ю.С. Сапегі, 12.02.1743, Кодань, l. 127; НГАБ, фонд 1710, вопіс 1, справа 13, apk. 1062, 1065–1066, 1156; AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192.
[65] LMAB f. 139, b. 4982, M. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 16.02.1743, Варшава, l. 46.

[66] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Юры Феліцыян Сапега да Ю.С. Сапегі, 05.02.1743, Чарлёна, l. 148. AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 192.
[67] BN, BOZ 941, k. 372.
[68] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Юры Феліцыян Сапега да Ю.С. Сапегі, б. д., б. м., l. 185.
[69] LMAB, f. 139, b. 2711, М. Масальскі да Ю.С. Сапегі, 18.02.1743, Вяйсеі, l. 70.
[70] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 16.02.1743, Варшава, l. 46–47.
[71] AGAD, AR, dz. IV, teka 45, koperta 630, г. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 17.02.1743, Бяла, k. 42–43.
[72] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 23.01.1743, Наваградак, k. 189–190.
[73] AGAD, AR, dz. IV, teka 50, koperta 663, г. Ф. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 12.02.1743, Нясвіж, k. 145.
[74] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 10.02.1743, Дзятлава, k. 191.
[75] AGAD, AR, dz. II, 2624, k. 1–4; *Matuszewicz M.* Diariusz życia mego, 2 toma. – Warszawa, 1986. – T. 1. – S. 205.
[76] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 20.02.1743, Варшава, l. 48–48 v.
[77] LMAB, f. 139, b. 2711, Копія ліста М. Чартарыйскага да М.А. Сапегі, 02.03.1743, Варшава, p. 91.
[78] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 02.03.1743, Варшава, l. 50–51 v; LMAB, f. 139, b. 2711, Копія ліста М. Чартарыйскага да М.А. Сапегі, 02.03.1743, Варшава, p. 91.
[79] LMAB, f. 139, b. 2711, Копіі лістоў, l. 88, 89, 90.
[80] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 23.03.1743, Варшава, l. 52–52 v.
[81] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Копія ліста М. Чартарыйскага да М.А. Сапегі, 30.03.1743, Варшава,, l. 181.
[82] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 02.03.1743, Варшава, l. 51 v; LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Копія ліста М. Чартарыйскага да М.А. Сапегі, 30.03.1743, Варшава, l. 181; LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 06.04.1743, Варшава, l. 54; LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 20.04.1743, Варшава, l. 56.
[83] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, Юры Феліцыян Сапега да Ю.С. Сапегі, б. д., б. м., l. 185.
[84] LMAB, f. 139, b. 3091, М. Агінскі да Ю.С. Сапегі, 05.03.1743, Маладзечна, l. 47; LMAB, f. 139, b. 3091, М. Агінскі да Ю.С. Сапегі, 17.04.1743, Лукішкі, l. 52. Яшчэ адным канкурэнтам быў троцкі дэпутат, троцкі цівун і троцкі падваявода Андрэй Укольскі. – AGAD, AR, dz. V, nr 17503, cz. 10, М. Вішнявецкі да М.К. Радзівіла, 23.02.1743, Каролін, k. 70.
[85] LMAB f. 139, op. 1, b. 4473, К. Сулістроўскі да Ю.С. Сапегі, 17.?.1743, б. м., l. 8; LMAB f. 139, op. 1, b. 4473, К. Сулістроўскі да Ю.С. Сапегі, 28.11.1742, Вільня, l. 9.
[86] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 01.04.1743, Мыта, l. 180.
[87] *Skibiński M.* Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriacką, – T. 1. – Kraków, 1912. – S. 331–332.
[88] BN, BOZ 941, k. 375.
[89] AGAD, AR, dz. V, nr 17503, cz. 10, M. Wiśniowiecki do M.K. Radziwiłła, 23.02.1743, Karolin, k. 70; *Matuszewicz M.* Diariusz życia mego, 2 toma. – Warszawa, 1986. – T. 1. – S. 210; BN, BOZ 941, k. 375.
[90] *Zielińska Z.* Walka "Familii" o reforme Rzeczypospolitej, 1743–1752. – Warszawa, 1983. – S. 52–53.
[91] AGAD, AR, dz. IV, teka 45, koperta 630, г. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 24.06.1743, Бяла, k. 68.
[92] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 08.04.1743, Мерач, l. 172–172 v.
[93] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 08.04.1743, Мерач, l. 173–173 v.
[94] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 08.04.1743, Мерач, l. 174–174 v.
[95] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 08.04.1743, Мерач, l. 174 v.–175.
[96] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 08.04.1743, Мерач, l. 174 v.

[97] AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 19.02.1743, Наваградак, k. 204. Адначасова Барбара Радзівіл настойвала, каб абавязкова не былі дапушчаны ў лік суддзяў ашмянскія і гарадзенскія дэпутаты, якія былі абраны з пратэстамі. – AGAD, AR, dz. IV, teka 47, koperta 638, Б. Радзівіл да М.К. Радзівіла, 31.03.1743, Дзятлава, k. 221.
[98] LMAB f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 20.04.1743, Варшава, l. 56–56 v.
[99] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 01.04.1743, Мыта, l. 180–180 v.
[100] LMAB f. 139, op. 1, b. 4062, М.А. Сапега да Ю.С. Сапегі, 01.04.1743, Мыта, l. 180 v.
[101] BN, BOZ 941, k.375.
[102] BN, BOZ 941, k. 375.
[103] LMAB, f. 139, b. 2711, Копія ліста М. Чартарыйскага да М.А. Сапегі, 20.05.1743, Вяйсеі, l. 82.
[104] LMAB, f. 139, b. 2711, Копія ліста да ксёндза Уладзіслава Любеньскага, l. 82 v.
[105] AGAD, Archiwum Roskie LVI/7, М.А. Сапега да Юзафа Францішка Сапегі, 17.05.1743, Вільня, k. 230.
[106] LMAB, f. 139, b. 2711, М. Масальскі да Ю.С. Сапегі, 03.06.1743, Вяйсеі, l. 79.
[107] LMAB, f. 139, b. 4982, М. Чартарыйскі да Ю.С. Сапегі, 08.06.1743, Прыбыславіцы, l. 58–58 v.
[108] AGAD, Archiwum Roskie LVI/7, М.А. Сапега да Юзафа Францішка Сапегі, 28.05.1743, Вільня, k. 237.
[109] AGAD, Archiwum Roskie LVI/7, М.А. Сапега да Юзафа Францішка Сапегі, 24.10.1743, Вільня, k. 240.